***А. С. Балуш,***
***І. У. Піскун***

*Навуковы кіраўнік*
***К. Р. Федарцова***

*Беларускі гандлёва-эканамічны*
*ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі*
*г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*

# СМАЙЛІКІ – ІНАВАЦЫЯ Ў ПУНКТУАЦЫІ

У пісьмовай практыцы да пачатку XIX ст. існавалі ўсе знакі прыпынку, што і ў наш час. Аднак пастаноўка іх доўгі час праводзілася адвольна і непаслядоўна. Толькі ў ХХ ст. былі канчаткова вызначаны прынцыпы, якія ляжаць у аснове сучаснай пунктуацыі, і ўстаноўлены правілы ўжывання кожнага знака прыпынку.

Традыцыйна выдзяляюць 9 знакаў прыпынку: . , ; – : ? ! ... () . Двукоссе (“ ”), квадратныя дужкі ([ ]), злучок ці дэфіс (-) знакамі прыпынку не з’яўляюцца. Апошнім часам да знакаў прыпынку адносяць смайлікі (англ. smile – усмешка) – значкі для перадачы эмоцый у пісьмовых зносінах (на форумах, у чатах, sms, электроннай пошце). Звычайна яны малююцца ў выглядзе жоўтага круга з дзвюма чорнымі кропкамі, якія прадстаўляюць вочы, і чорнай дугой, што сімвалізуе рот. Менавіта смайлікі з’яўляюцца больш дасканалым графічным сродкам адлюстравання эмацыйнага настрою суразмоўцы.

Аўтар смайліка – прафесар універсітэта Карнегі-Мелана штата Пенсільванія (ЗША) Фалман Скот. «Функцыя смайліка блізкая да функцыі знака прыпынку, таму ўсё часцей у беларускамоўнай інтэрнэт-прасторы можна сустрэць такія запісы: стаяла :–) у вачах радасць; мне было : – ( у цябе сумна»[1]. Як заўважаем, літара ў не пішацца пасля смайліка-знака прыпынку. Ёсць меркаванне, што хутка смайлікі афіцыйна будуць лічыцца знакамі прыпынку, паколькі яны адпавядаюць сэнсаваму (выкарыстоўваюцца з мэтай удакладнення, канкрэтызацыі сэнсу асноўнага паведамлення) і інтанацыйнаму прынцыпу пунктуацыі (багата і разнастайна дапаўняюць сэнс выказвання, удакладняюць яго экспрэсіўна-інтанацыйную афарбоўку). Пры зносінах у рунэце яны выкарыстоўваюцца, як правіла, разам з кірылічнай графікай, уключаюцца непасрэдна ў структуру выказвання, аддзяляюцца ад адзінак выказвання прабеламі або коскамі.

У інтэрнэце прынята мець зносіны хутка. Таму людзі пачалі карыстацца кароткімі спалучэннямі стандартных знакаў. Найбольш часта ўжываюцца наступныя:

1. :–) звычайны «смайлік» – усмешачка;
2. ;–) – хітрая ўсмешка;
3. :–D – шырокая ўсмешка;
4. :– (– выраз суму;
5. : ~ – (– выраз суму са слязой, што капае з вачэй;
6. 8O – неверагодна здзіўлены выраз твару;
7. : – | – які казаў абсалютна сур’ёзны;
8. : – P – хітрая ўсмешка з язычком у кутку рота;
9. : – * – пацалунак;
10. : – E – выскаленыя зубы.

Такім чынам, сучасная пунктуацыя – дасканалая сістэма правіл, якія вызначаюць паста-ноўку розных знакаў прыпынку на пісьме. Асноўныя правілы пунктуацыі маюць нарматыўны характар, бо змяшчаюць афіцыйна прынятыя нормы пунктуацыйнага афармлення сказа. Яны аднолькавыя і абавязковыя для ўсіх, хто піша або чытае пісьмовы тэкст. Таму будзем чакаць удакладнення ў правілы беларускай пунктуацыі, звязаныя са смайлікамі.

---

[1] Матэрыял з Вікіпедыі – вольнай энцыклапедыі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://ru.wikipedia.-org/wiki/Смайлик (дата доступу : 31.03.2016).